ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі
_______________ М.А. Сакалова
«22» студзеня 2021 года

# Раённы літаратурна-патрыятычны конкурс "Наша слова пра Беларусь"

ПАЛАЖЭННЕ

аб раённым літаратурна-патрыятычным конкурсе "Наша слова пра Беларусь"

АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Раённы літаратурна-патрыятычны конкурс прымеркаваны да Году адзінства народа краіны.
2. Арганізатарамі Конкурсу з'яўляюцца аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дрыбінскага райвыканкама, ДУК "Дрыбінская бібліятэчная сетка".
3. Дадзенае Палажэнне вызначае мэты, задачы, умовы і тэрміны правядзення конкурсу.

МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ:

Конкурс з'яўляецца адкрытым і праводзіцца ў мэтах фарміравання ў насельніцтва, найперш - у моладзі - актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, пачуцця прыналежнасці да гісторыі краіны і актыўнага яе вывучэнню праз кнігі;

павагі да гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны;

выяўленне літаратурных творчых здольнасцей моладзі і падлеткаў;

папулярызацыя літаратурнага краязнаўства ў рэгіёне.

ўмацаванне сувязяў паміж пакаленнямі, прыцягненне бацькоў і дзяцей, мясцовых паэтаў, педагогаў да сумеснай творчай працы;

ТЭМАТЫКА ТВОРАЎ - самая розная: Радзіма, мужнасць народа, уславленне канкрэтнага подзвігу, міру, супрацоўніцтва, чалавек працы, сяброўства і самых прыгожых чалавечых памкненняў, родная прырода.

ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Прыняць удзел у конкурсе можна індывідуальна або ў сааўтарстве.

Конкурс праходзіць у наступных узроставых катэгорыях:

1. 12 гадоў-18 год (уключна)
2. 19 гадоў -35 гадоў (уключна)
3. 36 гадоў – 55 гадоў
4. 56 гадоў і старэй

Мовы конкурсу - руская і беларуская.

НАМІНАЦЫІ КОНКУРСУ.

1. Паэзія - балада, верш, верш у прозе, цыкл вершаў.
2. Проза – апавяданне, навела, мініяцюра, замалёўка і інш.
3. Публіцыстыка - эсэ, нарыс, інтэрв'ю, рэпартаж, маналог, біяграфічныя нататкі.

Кожны аўтар можа падаць на Конкурс 1 і больш творчых прац (дапускаецца ўдзел аднаго аўтара ў конкурсе па некалькіх намінацыях).

У кожнай намінацыі выдзяляюцца па 1 пераможцу ў кожнай узроставай групе.

АФАРМЛЕННЕ РАБОТ І ПАДАЧА ІХ НА КОНКУРС.

Конкурсныя работы прымаюцца як набраныя на лістах , так і рукапісныя

Аб'ём твора ў жанры малай прозы - не больш 2,5 старонкі фармата А4.

Адна конкурсная работа – адзін твор.

Назва файла павінна ўтрымліваць прозвішча аўтара і назву намінацыі, прыклад – у дадатку.

Да конкурсных работ асобным файлам прыкладаюцца звесткі пра аўтара і работу:

- Прозвішча, імя
- Месца пражывання
- Кантактны тэлефон, адрас, е-мэйл.
- Узроставая катэгорыя працы
- Намінацыі, у якіх прадастаўляюцца працы

СПОСАБ ПАДАЧЫ РАБОТ НА КОНКУРС.

Друкаваныя работы дасылаюцца на адрас:

**213971. п.г.т. Дрыбін,**
**Вул. Леніна, 39,**
**Цэнтральная раённая бібліятэка,**

або па электронным адрасе: **dribin.bib@tut.by**
з паметкай на «Конкурс».

Работы прымаюцца таксама непасрэдна ў Цэнтральнай раённай бібліятэцы.

У населеных пунктах раёна ўдзельнікі могуць таксама звяртацца ў бібліятэкі для абмеркавання ўмоў конкурсу і перадачы работ арганізатарам.

КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ КОНКУРСНЫХ РАБОТ

Змест:

- адпаведнасць твораў тэматыцы конкурсу;
- арыгінальнасць і свежасць задумкі;
- паўната прапрацоўкі персанажаў і апісанняў;
- складнасць і паслядоўнасць развіцця думкі.

ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца з 25 студзеня 2021 года па 25 чэрвеня 2021 года.

Прыём прац: да 26 чэрвеня 2021 г.

Праца журы, вызначэнне пераможцаў – да 29 чэрвеня 2021 г.

Дасылаючы сваю працу на Конкурс, аўтар прадастаўляе права арганізатарам конкурсу на некамерцыйнае выкарыстанне прадстаўленага матэрыялу з указаннем аўтарства (размяшчэнне ў сетцы Інтэрнэт, тэлепраграмах, удзел у творчых праектах, публікацыі ў СМІ, далейшае тыражаванне і да т.п.) у рамках папулярызацыі ідэй конкурсу, правядзення літаратурных мерапрыемстваў, паседжанняў клубаў і інш.

УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ.

Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны дыпломамі і памятнымі сувенірамі.

Лепшыя работы будуць апублікаваны на літаратурных старонках газеты “Савецкая вёска”.

Па выніках конкурсу плануецца выданне электроннага зборніка лепшых твораў, які будзе размешчаны на інтэрнэт-платформах з магчымасцю адкрытага доступу чытачоў.

ЖУРЫ КОНКУРСУ

Старшыня:

Сакалова Марына Аляксандраўна, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дрыбінскага райвыканкама,

Члены:

Хальчукова Тамара Пятроўна, метадыст аддзела па адукацыі, спорту і турызму Дрыбінскага райвыканкама,

Верам’ёва Святлана Ігараўна, дырэктар ДУК “Дрыбінская бібліятэчная сетка”,

Брычыкава Тацццяна Уладзміраўна, галоўны рэдактар газеты “Савецкая вёска”, старшыня РА РГА “Белая Русь” .

Электронная версія Палажэння адпавядае арыгіналу.